

НА ШЛЯХУ Ў ПАРЫЖ 9

АБ ГІСТОРЫІ, СЯБРОЎСТВЕ І КАХАННІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2024 г. СУБОТА № 165 (30299)

КОРАТКА

- **Адукацыя — аснова сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы, заявіла Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля Качанава падчас Мінскага гарадскога адукацыйнага форуму педагагічных работнікаў.**
- Сяўбу азімых збожжавых у Мінскай вобласці правядуць на плошчы каля 400 тыс. га.
- **Парк школьных аўтобусаў Гомельскай вобласці ў 2024 годзе папоўніцца 35 адзінкамі транспарту.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«З гэтага года ў кожнай установе адукацыі штомесяц будзе праходзіць інфармацыйная гадзіна, прысвечаная вывучэнню такой важнай для нас тэмы, як генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адпаведныя навучальныя дапаможнікі распрацаваны сумесна з Генеральнай пракуратурай для ўсіх вучняў з 1-х да 11-х класаў. А дзесяцікласнікі з 1 верасня пачнуць вывучаць новы прадмет «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». гэта не проста перапрацаваны вучэбны дапаможнік. Фактычна гэта светапоглядная, ацэначная работа нашых гісторыкаў на тыя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны са старажытных часоў да сучаснасці».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЕЎРОПЕ ПАТРЭБНЫ НОВЫ ДАГАВОР АБ МІРЫ»

## У чым супадаюць пазіцыі Беларусі і Каталіцкай царквы

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Апостальскім нунцыем Антэ Ёзічам, які заканчвае сваю місію ў Беларусі. Рымска-каталіцкая царква ў нашай краіне з'яўляецца другой канфесіяй па колькасці вернікаў. Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Святым прастолам устаноўлены 11 лістапада 1992 года. У Мінску дзейнічае Апостальская нунцыятура. Аляксандр Лукашэнка двойчы наведваў Ватыкан з афіцыйнымі візітамі — у 2009 і 2016 гадах. Антэ Ёзіч прадстаўляў інтарэсы Ватыкана ў Беларусі з 2020 года.**



Фота БелТА.

«Мне прыемна з вамі сустрэцца, чалавекам разумным, адукаваным і, самае галоўнае, вельмі дзейным, вельмі актыўным і добразычлівым», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён прызнаўся, што з вялікай цеплынёй успамінае свае сустрэчы з Папам Рымскім: «Мне пашанцавала, кіраўнікі Каталіцкай царквы, з якімі я сустракаўся, былі таксама вельмі сур'ёзнымі і прыстойнымі людзьмі».

«Мне з вамі лёгка размаўляць як з прадстаўніком канфесіі, адной з асноўных у Беларусі, таму што нашы погляды — кіраўніцтва Беларусі і Ватыкана — практычна супадаюць, асабліва па пытаннях бяспекі. Па пытаннях бяспекі ў Еўропе нашы пазіцыі абсалютна сугучныя. І гэта паказвае канфлікт на Украіне, наконт якога мы займаем літаральна аднолькавую пазіцыю. Я з вамі абсалютна згодны, і мы даўно пра гэта казалі: Еўропе, каб жыць спакойна і жыць так, як мы жывём (як бы мы ні плакаліся, жывём нядрэнна), патрэбен новы дагавор аб міры. Патрэбны новы мір, калі можна так сказаць, у Еўропе. Думаю, што для гэтага актыўнасці Каталіцкай царквы не дастаткова. Трэба яшчэ, каб у еўрапейскіх краінах былі моцныя кіраўнікі, якія зыходзілі б з таго, што трэба бачыць яшчэ інтарэсы і сваіх народаў, а не толькі падпарадкоўвацца камусьці. Трэба бачыць інтарэсы сваіх народаў. На жаль, няхай яны на мяне не пакрыўдзяцца, я такога не бачу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падзякаваў Антэ Ёзічу за дапамогу, якую Каталіцкая царква аказала пры вызваленні 30 беларускіх грамадзян пасля пачатку СВА ва Украіне. «Мы гэта вельмі шануем і будзем памятаць, не забудземся пра гэта», — сказаў ён.

«Я б вас вельмі прасіў, каб вы падрыхтавалі будучага пасланніка ў Беларусь і каб ён быў лепшым, чым папярэдні, у гэтым ёсць сутнасць праграсу. Але мы будзем задаволены, калі новы пасланнік Папы Рымскага будзе такі, як Ёзіч, мы абсалютна згодны з гэтым. Яшчэ раз паўтараю: мне прыемна з вамі сустрэцца, абмеркаваць тыя пытанні, якія назапасіліся ў адносінах паміж Беларуссю і Ватыканам і Каталіцкай царквой у Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Ёсць пытанне

# Узрост магчымасцяў?

### Герантолагі раяць пенсіянерам працягваць планаваць будучыню і не адмаўляцца ад прафесійных амбіцый



**«Я толькі жыць пачынаю — на пенсію выходжу!»: фраза з савецкага мультфільма ў XXI стагоддзі ўжо не здаецца камічнай. Многія нашы сучаснікі дасягаюць пенсіённага ўзросту, захоўваючы сілы і здароўе. Не трэба ставіць сабе штучных рамак, каб дагадзіць састарэлым стэрэатыпам, сцвярджае кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра актыўнага даўгалецця, галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ.**

СТАР. 5

Час маладых

# І ДОБРЫЯ ЎСПАМІНЫ, І ЗАРОБАК

### Чаму студатрадаўскі рух на Гродзеншчыне не збаўляе тэмпы

**Чарговы працоўны семестр падыходзіць да завяршэння. І хоць некаторыя студатрады яшчэ будуць запатрабаваны на асенні перыяд, асноўная іх частка завяршыла сваю работу. Згодна з данымі абласнога штаба па каардынацыі і кантролі за работай студэнцкіх атрадаў, у Гродзенскай вобласці сёлета працаўладкавана больш за восем тысяч чалавек. Некаторыя ўдзельнікі студатрадаў падзяліліся ўражаннямі і расказалі, колькі яны зарабілі падчас летняй працы.**

СТАР. 7



ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 24165